# ВОДЗЫЎ АПАНЕНТА

на дысертацыю **Косцінай Жаны Вячаславаўны "Эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя"**, якая прадстаўлена на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура

**Адпаведнасць зместу дысертацыі заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі**

Змест дысертацыі, яе асноўныя палажэнні і вынікі сведчаць пра тое, што прадстаўленая праца адпавядае заяўленай спецыяльнасці *10.01.01 – беларуская літаратура* і галіне навукі "Філалогія", а таксама патрабаванням ВАК, якія прад'яўляюцца да дысертацыі на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

**Актуальнасць тэмы дысертацыі**

Дысертацыя *Косцінай Жаны Вячаславаўны "Эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя"* з'яўляецца актуальным для сучаснага беларускага літаратуразнаўства даследаваннем, накіраваным на сістэмнае вывучэнне ідэйна-эстэтычнай змястоўнасці і спецыфікі літаратуры Беларусі першай паловы XIX ст. У дысертацыі навукова актуалізаваны асноўныя творчыя канцэпцыі пісьменнікаў таго перыяду, прааналізаваны эстэтычныя складнікі дамінуючых матываў іх творчасці (Я. Чачот, В. Дунін-Марцінкевіч, У. Сыракомля, Ю.У. Нямцэвіч, Я. Ходзька, А. Міцкевіч, Т. Зан, В. Каратынскі, Я. Баршчэўскі, Т. Лада-Заблоцкі, Ю.І. Крашэўскі, інш.). Дысертант аналізуе ідэйны змест і паэтыку маладаследаваных літаратуразнаўствам жанраў літаратурнай калыханкі, аўтарскай казкі ў кантэксце эстэтыкі рамантызму.

Удумлівы даследчыцкі разгляд вялікага аб'ёму рознажанравага гісторыка-літаратурнага матэрыялу дазволіў дысертанту вылучыць і сфармуляваць вызначальныя рысы паэтыкі, накірункі творча-эстэтычных пошукаў літаратараў таой эпохі. Аргументавана прасочаны працэс фарміравання ідэалогіі і эстэтыкі новай беларускай літаратуры, выяўлены складнікі эстэтычнага ідэалу – шматграннай катэгорыі, якая ў літаратуры абранага перыяду прэзентавала погляды творцаў, культурна-інтэлектуальнай эліты тагачаснага грамадства, на разуменне стваральнага, гарманічнага жыцця асобы, народа і прыгожага, каштоўнага, узвышанага ў ім.

Актуальнасць дадзенага даследавання абумоўлена неабходнасцю далейшага навуковага вывучэння беларускага гісторыка-літаратурнага працэсу мінулых эпох паводле сучасных метадалагічных стратэгій, а таксма вызначэннем сацыякультурнай, аксіялагічнай, духоўна-эстэтычнай значнасці літаратурнай спадчыны для сучаснай гуманітарна-адукацыйнай прасторы Рэспублікі Беларусь.

Матэрыялы працы і высновы дысертанта каштоўныя і актуальныя пры выкладанні гісторыі беларускай літаратуры не толькі ў ВНУ, але і пры вывучэнні пытанняў гісторыі роднай літаратуры ў агульнаадукацыйных

установах Рэспублікі Беларусь: творы Я. Чачота, У. Сыракомлі, В. Дуніна-Марцінкевіча, А. Міцкевіча, Я. Баршчэўскага, інш. уваходзяць у школьныя праграмы. Таму запатрабавана іх паглыбленая, абноўленая культурна-гістарычная інтэрпрэтацыя.

**Ступень навізны вынікаў, атрыманых у дысертацыі, навуковых палажэнняў, вынесеных на абарону**

Дысертацыя Касцінай Ж.В. вызначаецца дастатковай навуковай навізной. Гэта – удалая спроба рэалізаваць сучасныя канцэптуальныя гісторыка-культурныя, агульнаэстэтычныя, аксіялагічныя, семіятычныя падыходы для ўстанаўлення аб'ектыўнай значнасці літаратуры першай паловы XIX стагоддзя як вытокавага перыяду, калі адбывалася станаўленне ідэйна-эстэтычнага, ідэалагічнага аспектаў фарміравання ўсяго беларускага літаратурнага працэсу Новага часу. Варта падкрэсліць мэтазгоднасць абраных метадалагічных стратэгій, выніковасць іх рэалізацыі, што забяспечыла навуковую навізну, аргументаванасць высноў дысертанта. Неабходна падкрэсліць і дастатковы навукова-тэарэтычны ўзровень дысертацыі Касцінай Ж.В.

Належнай навуковай навізной вызначаюцца *палажэнні, вынесеныя на абарону*.

Важна, што ў 1-м, тэарэтычным, палажэнні пры вызначэнні сутнасці і аб'ёму паняцця *эстэтычны ідэал* у гуманітарных навуках (філасофіі, эстэтыцы, мастацтвазнаўстве) слушна падкрэсліваецца *ўніверсалізм* гэтага паняцця і ў літаратуразнаўстве. Дысертант прымае за аснову канцэпцыю расійскіх вучоных А.Ф. Лосева і В.П. Шастова аб трох узроўнях выяўлення (функцыянавання) *эстэтычнага* ў змесце і структуры твора. Паводле гэтай канцэпцыі і з улікам сацыяльна-гістарычных абставін, якія абумовілі спецыфіку нацыянальнай традыцыі (у тым ліку, польскамоўнасць), упершыню сістэмна даследуюцца *эстэтычныя складнікі* літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя, якія фарміруюць канкрэтызаваны змест паняцця *эстэтычны ідэал*.

Каштоўна, што дысетрант звяртаецца да праблематыкі крытычных артыкулаў, дакументальных нарысаў і нататак шэрагу літаратараў, у якіх дэкларуецца іх аўтарская пазіцыя і выяўляецца разуменне эстэтычнага (прыгожага, маральнага, дасканалага, узвышанага). Слушна падкрэсліваецца, што ў пэўнай меры паняцце эстэтычнага ідэалу супадала з разуменнем прынцыпа народнасці ў літаратуры і літаратуразнаўстве.

Прынцыповую навуковую навізну ўтрымлівае 2-е палажэнне дысертанта аб выяўленні эстэтычнага ідэалу ў літаратуры Беларусі першай паловы XX ст. праз модус *рамантычнай іроніі*, што Ж.В. Касціна лічыць "асноўным эстэтычным прынцыпам" літаратурнага працэсу гэтага часу (с. 32 – 48 дысертацыі). Дысертант *упершыню ў айчынным літаратуразнаўстве* тэарэтычна і аналітычна выяўляе паэтыку і функцыі рамантычнай іроніі як адметнага тыпу мастацкага мыслення аўтара і кампазіцыйнага прыёму структуравання твора (гл.: 2.1 і 2.2 дысертацыі).

Несумненную навуковую навізну і даследчыцкую арыгінальнасць

утрымлівае 3-е палажэнне, канцэптуальная змястоўнасць якога раскрываецца ў главе 3 "Рэпрэзентацыя эстэтычнага ідэалу на розных узроўнях мастацкага мыслення" (с. 48–91дысертацыі). У сістэме эстэтычных каштоўнасцей літаратуры Беларусі гэтага перыяду дысертант цалкам абгрунтавана вылучае "духоўна-рэлігійныя" і "гісторыка-патрыятычныя" складнікі. У тэксце дысертацыі гэта доказна аргументуецца аналізам твораў Я. Аношкі, Я. Чачота, У. Сыракомлі, В. Каратынскага, Я. Баршчэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, Ю.У. Нямцэвіча, А. Міцкевіча і некаторых іншых. Даследчыца слушна ўдакладняе сродкі рэпрэзентацыі гісторыка-патрыятычнай і духоўна-рэлігійнай (маральна-этычнай) парадыгмаў як стратэгій выяўлення эстэтычнага ідэалу ў спадчыне тагачасных творцаў.

Важна, што, інтэрпрэтуючы тыпалогію герояў літаратуры гэтага часу (селянін і шляхціц), даследчыца адмаўляецца ад распаўсюджанага спрошчанага ўяўлення аб "сацыяльных ролях". Косціна Ж.В. аб'ектыўна і доказна выяўляе грамадска-гістарычную ролю шляхты як захавальніка гістарычнай памяці, носьбіта маральных дабрачыннасцей, стваральніка ў тым ліку і літаратурна-эстэтычных каштоўнасцей свайго народа.

Навуковай навізной, мэтазгоднасцю і арыгінальнасцю вылучаецца ідэя дысертанта аб мастацка-эстэтычным феномене вобраза паэта, творцы як носьбіта светапоглядна-эстэтычных каштоўнасцей свайго народа ў літаратуры першай паловы XIX ст., што канцэптуальна аргументуе прадмет даследавання. Важную навуковую навізну ўтрымлівае выснова аб дамінуючым у творах гэтага часу вобразе паэта-выгнанніка, творцы-пілігрыма, што адпавядала і рамантычнай эстэтыцы літаратуры гэтага часу, і гісторыка-палітычным рэаліям.

Дысертацыя ўтрымлівае значную навуковую навізну, уяўляючы паспяховую наватарскую спробу прадставіць эстэтычныя пошукі беларускай літаратуры ў кантэксце паэтыкі еўрапейскага рамантызму, у тым ліку нямецкага. Праведзеныя ўпершыню трапныя параўнанні, мастацкія паралелі паэтыкі (раслінна-кветкавая сімволіка, вобразы-локусы воднай плыні, гары/кургана) твораў фальклору, айчыннай і замежнай літаратуры, па слушных высновах даследчыцы, сведчаць аб тыпалагічнай набліжанасці эстэтычных каштоўнасцей беларускай і еўрапейскай літаратуры. Высновы, матэрыялы даследавання прэзентуюць беларускую літаратуру неад'емным і адметным складнікам сусветнага літаратурнага працэсу, з уласцівымі ёй агульнакультурнымі кодамі і эстэтычнымі заканамернасцямі.

Несумненнай вартасцю прадстаўленай дысертацыі і сведчаннем узроўню кваліфікаванасці Ж.В. Косцінай з'яўляецца ўдумлівы, ацэначна-аналітычны падыход да мноства гісторыка-літаратурных, тэарэтыка-метадалагічных крыніц, да напрацовак і высноў папярэднікаў, якія займаліся вывучэннем праблем, якія так ці інакш закранаюць прадмет і аб'ект даследавання, увага да меркаванняў сучасных айчынных вучоных (І.Э. Багдановіч, А.І. Бельскі, І.А. Бурдзялёва, А.М. Макарэвіч, А.І. Мальдзіс, У.І. Мархель, С.Л. Мінскевіч, У.М. Казбярук, В.А. Каваленка, С.У. Калядка, Г.В. Кісялёва, А.С. Яскевіч, І.В. Саверчанка, М.В. Хаўстовіч, І.Ф. Штэйнер,

некаторых іншых). Удумлівае асэнсаванне набыткаў айчыннага літаратуразнаўства, прафесійнае валоданне метадалогіяй навуковага даследавання і навыкамі семіятычна-структурнага, параўнальнага аналізу дазволіла Ж.В. Косцінай унесці вышэй адзначаную навізну ў айчынны навуковы дыскурс аб літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя.

**Абгрунтаванасць і дасавернасць вывадаў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі**

Аб'ектыўнасць, дасавернасць высноў дысертацыі Ж.В. Косцінай несумненная. Навуковыя палажэнні, вынесеныя на абарону, атрыманыя вынікі, вывады і рэкамендацыі даследавання з'яўляюцца значнымі і перспектыўнымі для сучаснага літаратуразнаўства.

Дысертацыя Ж.В. Косцінай *"Эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы XX стагоддзя"* з'яўляецца самастойным кваліфікацыйным даследаваннем, якое сведчыць аб асабістым укладзе суіскальніка ў актуалізацыю і распрацоўку эстэтычнага, ідэйна-філасофскага і гісторыка-культурнага дыскурсу беларускай літаратуры дадзенага перыяду ў абраным накірунку – у вызначэнні эстэтычнага ідэалу.

Напрацоўкі і вынікі даследавання варта ўкараняць у гуманітарна-філалагічны і літаратурна-адукацыйны працэс РБ. Матэрыялы і высновы дысертанта неабходна рэкамендаваць для рэалізацыі пры вывучэнні ў ВНУ курса гісторыі беларускай літаратуры XIX стагоддзя, а таксама пры вывучэнні пытанняў эстэтыкі літаратурнага працэсу, паэтыкі рамантызму, сентыменталізму (уводзіны ў літаратуразнаўства, тэорыя літаратуры).

**Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні**

Вынесеныя на абарону тэарэтычныя палажэнні, распрацаваныя ў тэксце дысертацыі і шэрагу змястоўных публікацый аналітычныя матэрыялы і высновы дысертанта ўтрымліваюць навуковую, практычную і сацыяльную значнасць. Яны ўдакладняюць, канкрэтызуюць шэраг існуючых канцэпцый аб заканамернасцях літаратурнага працэса Беларусі першай паловы XIX стагоддзя, пашыраюць існуючыя навуковыя ўяўленні аб эстэтычнай, грамадзянскай, маральна-філасофскай змястоўнасці літаратуры Беларусі, у тым ліку і польскамоўнай.

Матэрыялы даследавання і высновы Ж.В. Косцінай варта задзейнічаць пры вывучэнні гісторыі беларускай літаратуры XIX стагоддзя на гуманітарных факультэтах ВНУ, найперш філалагічных, а таксама пры вывучэнні творчасці Я. Баршчэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, У. Сыракомлі, Я. Чачота, А. Міцкевіча на ўроках беларускай літаратуры ў агульнаадукацыйных установах РБ. Напрацоўкі па тэме даследавання мэтазгодна ўлічыць пры складанні абноўленых праграм па гісторыі беларускай літаратуры, рэкамендаваць пры напісанні курсавых і дыпломных прац студэнтаў, магістарскіх і інш. дысертацый, звязаных з праблематыкай даследавання.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку**

Дысертацыйнае даследаванне Ж.В. Косцінай прайшло належную

апрабацыю. Асноўныя палажэнні і вынікі працы адлюстраваны ў 28 публікацыях, з якіх 8 змешчаны ў спецыялізаваных навуковых выданнях, рэкамендаваных ВАК РБ (3, 56 аўт. арк.), 4 – у навуковых зборніках і часопісах (1, 31 аўт. арк.), 16 матэрыялаў навуковых канферэнцый (4, 11 аўт. арк.). Агульны аб'ём публікацый дысертанта па тэме даследавання – 8, 98 аўт. аркуша.

**Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК**

Дысертацыйнае даследаванне Ж.В. Косцінай выканана ў ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" ў Інстытуце літаратуразнаўства імя Янкі Купалы, у сектары гісторыі беларускай літаратуры ў межах ДПНД "Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства" (падпраграма "Беларуская мова і літаратура") на 2016 – 2020 гг.; заданне "Герменеўтыка і фенаменалогія беларускай літаратуры", падзаданне "Літаратурныя эпохі, перыяды і стылі ў беларускай літаратуры: X – пачатак XXI стст." на 2021 – 2025 гг.

Афармленне дысертацыі і аўтарэферата Ж.В. Косцінай адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да дысертацый і аўтарэфератаў на прысуджэнне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе**

Дысертацыя *Косцінай Жаны Вячаславаўны "Эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы XX стагоддзя"* з'яўляецца самастойным і актуальным даследаваннем. Дысертант выявіла дастатковы ўзровень навукова-тэарэтычнай кваліфікацыі, зрабіла шэраг важных для сучаснага беларускага літаратуразнаўства высноў. Ступень значнасці атрыманых вынікаў сведчыць, што Ж.В. Косціна мае навуковую кваліфікацыю, якая дазваляе ёй прэтэндаваць на прысуджэнне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук. *Дысертант Косціна Жана Вячаславаўна, на наш погляд, заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура.*

Высока ацэньваючы значнасць дысертацыі Ж.В. Косцінай, варта адзначыць **асобныя прыватныя заўвагі і ўдакладніць некаторыя моманты:**

1. Шматлікія спасылкі на даследчыкаў, якія пісалі пра эстэтычны ідэал, эстэтычныя каштоўнасці ў літаратуры і мастацтве, часам ствараюць уражанне фрагментарнасці, бессістэмнасці там, дзе дысертанту варта карэктна, навукова і дакладна выказвацца самой, фармуляваць уласныя погляды і меркаванні. За шматлікімі цытатамі вучоных савецкага перыяду (Г. Паспелаў, К. Гей, М. Храпчанка, Л. Гінзбург, М. Каган, В. Шастакоў, інш.), нямецкіх мысляроў і тэарэтыкаў рамантызму (Г. Гегель, Ф. Шэлінг, Ф. Шлегель, Ё.Г. Гердэр, інш.) часам губляецца ўласная логіка даследчыцы. Гэта датычыцца найперш першай главы, але, на жаль, не толькі.

Дысертант, вызначаючы сутнасць прадмета даследавання ў першай

главе, за метадалагічную аснову ўзяла напрацоўкі расійскіх вучоных А. Лосева і В. Шастакова, выкладзеных у манаграфіі "Гісторыя эстэтычных катэгорый", якая выдадзена 60 год таму. Варта было б звярнуцца да больш сучасных аўтарытэтных даследаванняў у філасофіі, эстэтыцы і літаратуразнаўстве аб эстэтычным ідэале. Дзеля справядлівасці варта адзначыць, што ў наступных главах дысертант спасылаецца на напрацоўкі беларускіх літаратуразнаўцаў па гэтай праблематыцы, што як станоўчы аспект працы было падкрэслена намі вышэй.

У сувязі з гэтам прапануем у дыскусіі на абароне ўдакладніць:

– Што мае дысертант на ўвазе пад "канцэптуальным узроўнем" раскрыцця эстэтычнага ідэалу? – пад "узроўнем арганізацыі твора як мастацкага цэлага"? – пад "узроўнем унутранай і знешняй формы літаратурнага твора? – якія суадносіны (іерархія) між гэтымі ўзроўнямі?

Паўторымся, што гэтыя пытанні ўзнікаюць па прычыне невыразнай абгрунтаванасці ўласных даследчыцкіх стратэгій.

2. У тэксце дысертацыі многа цытат, перакладзеных з рускамоўных крыніц на беларускую мову і часам узнікае пытанне сэнсавай логікі, адэкватнасці сэнсу. У шэрагу выпадкаў цытаты, на наш погляд, маюць ускосныя адносіны да прадмета і праблематыкі даследавання (напрыклад, цытаты Г. Паспелава (с. 13, 14), Л. Гінзбург, М. Храпчанка (с.14, 15 і інш.). У навуковых тэкстах варта цытаты прыводзіць у арыгінале (тым больш рускамоўныя) і ў перакладзе.

3. Выклікае дыскусійнасць *адназначнае сцвярджэнне,* што "*іронія ў* эстэтыцы рамантызму становіцца *асноўнай катэгорыяй*" (с. 32 дысертацыі); ("нямецкія рамантыкі ўвялі іронію на ўзровень філасофскай жыццёвай пазіцыі", с. 37). Наколькі "прынцып іроніі ў гісторыі", першапачаткова ўжыты Г. Гегелем, як піша дысертант на с. 32, мае эстэтычнае, метадалагічнае значэнне ў кантэксце даследавання?

4. Катэгарычныя, адназначныя дэкларацыі часам пярэчаць логіцы ўласнага дыскурсу даследчыцы. Напрыклад, на с. 108 дысертацыі заяўлена: "*Галоўнай формай* выяўлення ідэйна-мастацкага зместу пачынальнікі айчыннай літаратуры выбралі песню…, хаця аналізуюцца і іншыя жанры фальклору і літаратуры – казкі, калыханкі, празаічныя творы, паэмы…

5. У высновах да главы 2 (с. 47 дысертацыі), на наш погляд, дакладней было б сцвярджаць, што рамантычная іронія як эстэтычны прынцып найперш уплывала на жанравую спецыфіку, чым на "кампазіцыю твораў літаратуры Беларусі першай паловы XIX ст.".

6. Развагі дысертанта пра "сэнсаўтваральны патэнцыял эмоцый" (падраздзел 3.5), на жаль, абмяжоўваюцца пералікам эмацыянальных стаў персанажаў/герояў, хаця гэта давала магчымасць зрабіць выснову аб узроўні эматыўнасці паэтыкі (таксама тэрміналогія С.У. Калядкі) беларускага пісьменства дадзенага перыяду.

7. Да паняцця "духоўна-рэлігійныя каштоўнасці" (падраздзел 3.1), у большай ступені характрэнага канцэпцыям нямецкага рамантызму, у інтэрпрэтацыі твораў беларускіх пісьменнікаў варта было б ужываць і

сінонімы "маральна-этычныя, народныя, хрысціянскія каштоўнасці". Яны больш адпавядаюць беларускай ментальнасці, "народнаму духу" твораў літаратуры першай паловы XIX ст., што слушна падкрэслівалася дысертантам.

У тэксце дысертацыі зрэдку трапляюцца моўныя, стылёвыя недакладнасці, якія, як і выказаныя вышэй заўвагі, маюць прыватны характар і не ўплываюць на агульную станоўчую ацэнку працы Касцінай Ж.В.

**Заключэнне**

Дысертацыйнае даследаванне Касцінай Жаны Вячаславаўны (навуковы кіраўнік – доктар філалагічных навук, прафесар, дырэктар філіяла "Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі" І.В. Саверчанка) з'яўляецца кваліфікацыйнай навуковай працай, якая адпавядае п. 19 і п. 20 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь. Змест працы адпавядае спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура. Дысертацыя выканана на дастатковым тэарэтычным узроўні і на арыгінальным фактычным матэрыяле. Даследаванне Касцінай Ж.В. вызначаецца актуальнасцю, навуковай навізной, аргументаванасцю, тэарэтычнай і практычнай значнасцю для беларускага літаратуразнаўства.

Вучоная ступень кандыдата філалагічных навук можа быць прысуджана Ж.В. Касцінай **за:**

- сістэмна-аналітычнае выяўленне эстэтычнага і ідэалагічнага зместу беларускай літаратуры першай паловы XIX ст., наватарскую характарыстыку паэтыкі, ідэйных і аксіялагічных дамінант літаратуры беларускага рамантызму вытокавага перыяду;
- абгрунтаванне змястоўнасці паняцця *эстэтычны ідэал*, вызначэнне яго складнікаў/узроўняў, устанаўленне спецыфікі яго функцыянавання ў літаратуры таго часу; вызначэнне народнасці, народнага духу твораў як важнага эстэтычнага крытэрыю;
- выяўленне прыёму *рамантычнай іроніі* як аднаго з асноўных модусаў літаратурнай творчасці пісьменнікаў першай паловы XIX ст.;
- распрацоўку арнументаванага параўнальна-тыпалагічнага дыскурсу беларускай літаратуры першай паловы XIX ст. з эстэтыкай і сімволікай нямецкага рамантызму;
- доказную навукова-даследчыцкую прэзентацыю айчыннай літаратуры, яе агульнакультурных кодаў і эстэтычных заканамернасцей як арыгінальных і неад'емных эстэтычных складнікаў сусветнага літаратурнага працэсу.

Апанент –
прафесар кафедры беларускага і рускага
літаратуразнаўства і журналістыкі
УА "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна"
доктар філалагічных навук, прафесар З.П. Мельнікава

Паступіў у савет 20.01.2025
Вуч. сакр. [signature]
Азнаёмлена 22.01.2025 Касціна Ж.В.

АДДЗЕЛ КАДРАЎ

Подпіс Мельнікавай З.П. засведчваю
Нач. АК БрДУ [signature]